## Секция III

# ОТРАЖЕНИЕ НАЦИОНАЛЬНО-КУЛЬТУРНОГО КОМПОНЕНТА В ИНДИВИДУАЛЬНО-АВТОРСКОЙ КАРТИНЕ МИРА

УДК 821.161.3-09.84

**Балуш Татьяна Владимировна**
*кандидат филологических наук, доцент*
*кафедра общего языкознания*
*Минский государственный лингвистический университет*
*г. Минск, Беларусь*
*baltv@inbox.ru*

**Balush Tatiana**
*Candidate of Philological Sciences, Associate Professor*
*Department of General Linguistics*
*Minsk State Linguistic University*
*Minsk, Belarus*

**Иватович-Бабич Валентина Тадеушевна**
*кандидат филологических наук, доцент*
*кафедра славянских языков*
*Минский государственный лингвистический университет*
*г. Минск, Беларусь*
*viva1975@inbox.ru*

**Ivatovich-Babich Valiantsina**
*Candidate of Philological Sciences, Associate Professor*
*Department of Slavonic Languages*
*Minsk State Linguistic University*
*Minsk, Belarus*

## НАРОД У БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ
## (на матэрыяле паэзіі Я. Купалы і Я. Коласа)

В статье рассматривается индивидуально-авторская концептуализация народа, зафиксированная в художественных картинах мира Я. Купалы и Я. Коласа, устанавливаются универсальные и авторские характеристики анализируемого концепта, позволяющие выявить специфику индивидуального восприятия и художественного отображения народа Я. Купалой и Я. Коласом.

**Ключевые слова:** прецедентный текст, художественная картина мира, концепт, концептуализация.

## THE PEOPLE IN THE BELARUSIAN ARTISTIC PICTURE OF THE WORLD
## (on the material of the poetry of Yanka Kupala and Yakub Kolas)

The article deals with the individual author's conceptualization of the people, fixed in the artistic picture of the world by Y. Kupala and Y. Kolas. Universal and author's characteristics of the analyzed concept are established, allowing to reveal the specific character of individual perception and artistic representation of the people by Yanka Kupala and Yakub Kolas.

**Keywords:** precedent text, artistic picture of the world, concept, conceptualization.

Мастацкая карціна свету гэта не столькі вобраз свету, колькі вобраз адносін (стасункаў) аўтара да свету, а таму творчасць асобнага пісьменніка (паэта), а таксама асобна ўзяты тэкст – гэта адзін з магчымых варыянтаў інтэрпрэтацыі культурных універсалаў, сінтэз агульнанацыянальнага і індывідуальнага. Індывідуальная карціна свету рэпрэзентуецца мастацкімі канцэптамі, якія маюць універсальны і/або нацыянальны складнік (кампанент). Аднесці іх менавіта да мастацкіх канцэптаў не дазваляе індывідуальнае ўспрыманне гэтых ментальных адзінак творцай мастацкага тэксту.

Зварот да тэкстаў мастацкіх твораў дазваляе выявіць асобныя словы, якія маюць нагрузку асаблівага (адмысловага) сэнсу, якія з'яўляюцца важнымі для тэкста і ў цэлым выдзяляюцца сярод іншых моўных адзінак, з'яўляючыся носьбітам канцэптуальнай інфармацыі. Даследаваць тэкст на глыбінным узроўні дазваляе методыка канцэптуальнга аналізу, якая па сутнасці з'яўляецца тэкстацэнтрычнай. У межах кантэксту адбываецца пашырэнне семантычнага аб'ему даследуемай адзінкі, назіраецца «нарошчванне сэнсу», з'яўляецца шэраг асацыятыўных сувязей з іншымі культурна значнымі (важнымі) алдзінкамі, можа адбывацца пашырэнне прасторы тэксту за кошт імпліцытнай інфармацыі, якая змяшчаецца у ключавых канцэптах. Рэканструкцыя мастацкага канцэпта дазваляе выявіць як агульнакультурны, нацыянальны, так і індывідуальна-аўтарскі пласты.

Да канцэптуалізацыі народа неаднаразова звярталіся беларускія пісьменнікі і паэты, у прыватнасці Янка Купала і Якуб Колас, імёны і тэксты твораў якіх з'яўляюцца прэцэдэнтнымі для беларускага народа. Канцэпт «беларусы» ў паэзіі аўтараў выяўляеццца праз лексемы *беларусы, народ, мужык, брат* (*браце*), *люд*, а таксама займеннік *мы*. Гэты зборны вобраз у вершах паэтаў прадстаўлены неадназначна. Менавіта яны адны з першых надалі гэтаму моўнаму знаку кунцэптуальнае значэнне.

Уся творчасць Янкі Купалы і Якубу Коласа сведчыць пра тое, што паэты любяць свой народ, але любяць не слепа і не ідэалізуючы яго, любяць, бачачы ўсе недахопы і заклікаючы ад іх пазбавіцца, як добрая і клапатлівая маці, якая імкнецца выхаваць у ім лепшыя якасці. У сваіх творах паэты заклікаюць беларусаў азірнуцца на свае славутае мінулае, звяртаюцца да гістарычнай памяці народа: *Сягні ў даўно заснуўшыя сталецці, Заслону дзён уцёкшых адхілі, І глянь, як сёння твае жывуць дзеці, Як ты жывеш на прадзедаў зямлі...Ты жыў, ты панаваў у краі родным, Сцярог ад чужакоў й законы ўкладаў, Звон вечавы сход склікаваў народны, І сход аб шчасці Бацькаўшчыны дбаў* (Я. Купала. Свайму народу). Паэта як сапраўднага патрыёта хвалюе, што народ страціў сваю незалежнасць, волю, здабытую дзядамі, страціў свае карані: *Упаў народ. Змарнеў народ, забыўся, Як бацькаўшчыну, як яго завуць; Як падарожны без пуцця, знябыўся, Як сірата, якой нідзе заснуць* (Я. Купала. Свайму народу).

Даследаванне паэзіі Янкі Купалы і Якубу Коласа дазваляе вылучыць наступныя пазіцыі ў профілі канцэпта народ – «беларусы»:

● беларусы – народ працавіты: *Бо з працы хлеб я здабываю; Працую, як той вол рабочы* (Я. Купала. Мужык); *Затрымаю ваду, Цёмны бор павалю, А як з сошкай пайду, – Увесь свет накармлю* (Я. Купала. З песень беларускага мужыка); *З Новым годам, з шчасцем новым! / Дай жа Божа, гэты год / Как успомніў шчырым словам / Працавіты ўвесь народ!* (Я. Колас. На Новы год);

● беларусы – народ бедны, цёмны, забіты, неадукаваны, баязлівы: *Знай, шмат каму трэба з тваёй працы хлеба, Дый сам ты галодзен зусім* (Я. Купала. Аратару); *Чытаць, пісаць я не умею, Не ходзіць гладка мой язык...* (Я. Купала. Мужык); *Брат маркотны, брат мой бедны! / Гоняць нас, на нас плююць; Дзе ні пойдзеш – мы чужыя, Мала нас дзе, брат, паймуць* (Я. Колас. Згнанніку); *Белорус ты, белорус! / Ты смешон и жалок. / Ты забитый, бедный, трус, / Вышел из-под палок* (Я. Колас. Белоруссия); *Той жа нораў свой сярдзіты / Ці за лішак жару... / Гэта – цёмны люд, забіты, / Беднаты ахвяра* (Я. Колас. Катаржнікі); Будзеш ты чытаць нам, / Цёмнікам, няўмекам, / Што у кнігах пішуць, / Што мы ў свеце значым, / Бо мы самі цёмны, / Свету мы не бачым (Я. Колас. У школку); Бедната відаць усюды: / І ў адзежы і ў грашах; Людзі нейкія маруды; На ліцэ відзён іх страх. / Мужык цёмны: ён не знае, / Не умее ён чытаць, / Яго ўсякі абдувае, / А яму усе маўчаць (Я. Колас. Мужык).

Нягледзячы на сваю забітасць, убогасць і неадукаванасць купалаўскі і коласаўскі беларус настроены аптымістычна; ён верыць у будучыню: *Грамадзянская згода, супольнасць загосце, Аж усцешацца прадзедаў цені і косці, Слоў унука не зглушыць ніякі прымус, Што ёй, роднай зямлі, верны сын, беларус* (Я. Купала. Маладая Беларусь); *Адно мы добра ведаем: / Хоць вечна мы блукаемся, / А ўсё ж такі, хоць некалі, / А праўды дапытаемся* (Я. Колас. Наша возьме) яму ўласціва пачуццё уласнай годнасці: *Я – мужык, я гонар маю, / Гнуся, але да пары. / Я маўчу, маўчу, трываю, / Але скора загукаю: "Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!"* (Я. Колас. Мужык); *...Кожны народ сам сабе пан; І беларус можа змясціцца Ў сям'і нялічанай славян* (Я. Купала. Ворагам Беларушчыны);

● беларусы – народ безаблічны, паднявольны, галодны: *Табе, народ мой, згібнуты ў аковах...* (Я. Купала. Свайму народу); *Засадзілі ў клетку, / Волю адабралі, / Вобраз чалавечы / Ў гразь яны ўтапталі* (Я. Колас. Горкая доля); *Асмеяны, аблаяны, / Гразёю мы замазаны. / Багатымі мы скрыўджаны, / Няволяю мы звязаны* (Я. Колас. Наша возьме); *За народ, што пад ярмом / Шыю гне і спіну. / Што кляне лёс ціхачом / Кожную часіну* (Я. Колас. У няволі);

● беларусы – народ інертны, сонны, дрымотны, маўклівы: *А вы, адродкі Белай Русі, Спіце, як быццам кат засек* (Я. Купала. Там); *До спаць! Паўстаньце! Гэй, прасніся, беларусе?* (Я. Купала. Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні…).

Янка Купала у сваёй творчасці беларускі народ надзяляе асаблівай, індывідуальна-аўтарскай характарыстыкай – называе яго «тутэйшым», г.зн. пасіўным, абыякавым, які прыстасоўваецца да любых умоў жыцця: *Вось так ні то жыву і не жыву, Сваім, што бачу, не веру вачам, Што чую – не бяру ў галаву, І што я знаю – ужо не знаю сам. Спаўняючы, што трэба, а што не, Сяк-так мой цягнецца на свеце век, А як памру, то буду спаць, як пан, І сніць, што я тутэйшы чалавек* (Я. Купала. Тутэйшы).

У паэзіі Янкі Купалы беларусы – гэта яшчэ і народ-«паязджане», падарожныя, сіроты: У *бездарожжа, у беспрыстанне Едуць, едуць паязджане* (Я. Купала. Паязджане); *Мы дома – як не дома… Бог бадзяцца кінуў па бязмерным свеце* (Я. Купала. Цару неба й зямлі);

● беларусы – народ няшчасны, гаротны, народ, які не мае лёсу: *Я – мужык, я – сын пакуты, На мякине вырас я… Я – мужык, я – сын бядоты…* (Я. Купала. Я мужык-беларус); *Бацькам голад мне быў… Бяда маткай была…* (Я. Колас. Мужык); *Многа вынес народ гора / Многа горкіх слёз праліў, / Как сабраць іх, было б мора, / Ўсіх паноў бы патапіў* (Я. Колас. Даўнейшае); *Нашы слёзы незлічоны, / З нас крывавы льецца пот… / Люд забіты, люд хрышчоны. / Абяздолены народ!..* (Я. Колас. Наша доля);

● беларусы – народ, які ўмее спачуваць, «з душой і сэрцам»: *О, я знаю, сэрца маеш, бо па свінцы нават плачаш* (Я. Купала. Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні…);

● беларусы – народ без імені: *Народ змарнеўшы таго краю Свайго нат імені не знаў* (Я. Купала. Прарок); *Змарнеў народ, забыўся, Як бацькаўшчыну, як яго завуць* (Я. Купала. Свайму народу);

● беларусы – народ без мовы: *А што мовай пагарджаем, Дык мы гэтага не бачым* (Я. Купала. Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні…);

● беларусы – народ, які самастойна выбраў свой лёс: *Самі мы вінаваты ў нашай долі праклятай, у тым, што век мы бядуем ды плачам. Глянь, во англік ці немец – Яны ўсё ўмеюць скеміць Ім і шчасце і радасць пакорны; Мы ляжым, як мядзвёдкі, Як гнілыя калодкі, І нас топча, хто болей праворны; Спім сабе, ані дбаем, Палягчэння чакаем, быццам з неба нам зваліцца тое…* (Я. Купала. Шчасце).

Прызначэнне паэта, беларускага песняра, Янка Купала сфармуляваў у вершы «Песняру-беларусу»: *Шчаслівы ты ці нешчаслівы, Будзі сыноў сваёй зямлі, Над беларускай соннай нівай Нязгаслы светач распалі…. Глядзі –*

*ўскалышацца, прачнецца Мільённы прыспаны народ, І вокліч славы пранясецца Пяснярскай славы з роду ў род.* Імкнучыся «разбудзіць» праз мастацкае слова нацыянальную самасвядомасць, паэт заклікаў: *Паўстань, народ! Прачніся, беларусе: Зірні на Бацькаўшчыну, на сябе! ...Сваю магутнасць пакажы ты свету, Свой край, сябе ў пашане мець прымусь* (Я. Купала. Свайму народу); *Гэй, прачніся, беларусе!* (Я. Купала. Хоць ты, сэрца, лопні, трэсні...).

Янка Купала заклікае «пакрыўджаны» беларускі народ «людзьмі звацца»: *Эх, пакіньце крыўдамі карміцца, – Кожны народ сам сабе пан; І беларус можа змясціцца Ў сям'і нялічанай славян!* (Я. Купала. Ворагам Беларушчыны).

Лірыка Якуба Коласа ранняга перыяду – гэта шчырая і праўдзівая песня пра беларускую зямлю і яе народ пачатку XX стагоддзя, аднак смутак і боль пранізваюць яго творы. Пачынаючы з верша «Наш родны край», які быў надрукаваны ў газеце «Наша доля» в 1906 годзе.